Пятроў дзень (Пятро, Пятрок) – старажытнае земляробчае свята, якое з'яўляецца як бы працягам свята Купалля. Адзначаецца яно 29 чэрвеня ў гонар апосталаў Пятра і Паўла. У гэты дзень заканчваўся гадовы пост, які так і называўся – Пятроўскі, або Пятроўка. На Пятра прадказвалі надвор'е, назіраючы за паводзінамі зязюлі. Калі зязюля кукуе і пасля свята – восень будзе цёплай, сонечнай, а снег выпадзе позна. Калі ж зязюля замоўкне яшчэ да Пятра, то ўсіх чакае халодная восень і ранняя зіма. Пасля заканчэння посту пачынаўся сезон вяселляў.

Талака – даўні народны звычай калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах.Пасля таго, як дажата апошняя дзялянка і звязаны апошні сноп, робяць вянок, і талачэйкі кідаюць жэрабя, каму быць Талакой. На Талаку апранаюць вянок, карагод упрыгожвае яе кветкамі, прыпяваючы і, танцуючы, даюць ёй у рукі дажынкавы сноп, хаваючы яго пад белай хусткай. Затым усе ідуць парамі за Талакой у дом гаспадара. Гаспадар сустракае Талаку хлебам-соллю і кланяецца ёй у пояс. Талака аддае гаспадару дажынкавы сноп, затым гаспадар і гаспадыня вядуць Талаку ў дом і саджаюць у кут, пасля гэтага пачынаецца святочная вячэра. Пасля вячэры Талака здымае вянок і пакідае гаспадарам хаты, а покрыва застаецца дзяўчыне. Талаку ж выпраўляюць дадому.

Яблычны Спас святкуюць 6 жніўня. Хрысціяне адзначаюць Праабражэнне Госпада Бога. У гэты дзень асвячаюць плады (яблыкі, грушы, слівы), мёд і каласкі новага ўраджаю. Пачынаючы з гэтага дня, усё можна было ўжываць у ежу. Пасля Спаса пачыналі сеяць азімыя. У гэты дзень праводзіўся абрад знішчэння блашчыц.

ЛІТАРАТУРА:

1. Абрады і звычаі беларусаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Абрады_і_звычаі_беларусаў. – Дата доступу: 30.09.2018.
2. Верещагина, А. В. Праздники, обряды и таинства в жизни христиан Беларуси / А. В. Верещагина. – Минск: Белорусская наука, 2009. – 232 с.

# ЧАЛАВЕК ПРАЗ ПРЫЗМУ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ З САМАТЫЧНЫМІ КАМПАНЕНТАМІ

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
**Нюнько К.В., студэнтка 4 курса філалагічнага факультэта**
Кафедра беларускай філалогіі
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Садоўская А.С.

Фразеалагізмы – цікавыя моўныя адзінкі, кампанентны склад якіх складаецца з розных па семантыцы лексем. У фразеалагічным фондзе сучаснай беларускай мовы налічваецца звыш 7 тысяч адзінак, таму, відавочна, што словы, якія ўваходзяць у фразеалагізм, дастаткова разнастайныя па значэнні. У



Репозиторий ГрГМУ

гэтым артыкуле наша ўвага будзе звернута на тыя фразеалагізмы, якія ўтрымліваюць у сваім складзе саматычныя кампаненты. Такія фразеалагічныя адзінкі былі аб’ектам даследавання шматлікіх лінгвістаў, як айчынных, так і замежных, але часцей у параўнальна-супастаўляльным плане. Таму мы звернем увагу на асаблівасці функцыянавання гэтых выразаў у межах адной мовы. «Саматызмы – гэта назвы элементаў структуры цела чалавека, г.зн. непасрэдна частак цела (рука, нага, спіна), унутраных органаў (страўнік, лёгкія, печань) і органаў пачуццяў (вока, нос, скура), назвы касцей (чэрап, скулы, пазваночнік), валасоў (бровы, вейкі, валасы), прадуктаў жыццядзейнасці чалавека (пот, сліна, сляза)» [1, с. 26]. Адзначым той факт, што ў кампанентны склад фразеалагізмаў уваходзяць не толькі назвы частак цела чалавека, але і жывёл.

Ва ўтварэнні моўных адзінак рознага ўзроўню, у тым ліку і фразеалагічных, велізарную ролю адыгрывае чалавечы фактар, таму што пераважная большасць фразеалагізмаў звязана з чалавекам, з разнастайнымі сферамі яго дзейнасці. Фактар адрасата з'яўляецца найважнейшым элементам камунікацыі. Акрамя таго, чалавек імкнецца надзяліць чалавечымі рысамі аб'екты знешняга свету, у тым ліку і неадушаўлёныя. Шырокае ўжыванне саматызмаў у складзе фразеалагічных адзінак у значнай ступені абумоўлена тым, што саматычныя лексемы з’яўляюцца тым моўным пластом, які спадарожнівае чалавеку ад самага нараджэння, без такіх слоў не можа функцыянаваць ні адно грамадства, ні адна мова свету, таму невыпадкова яны ўваходзяць у ядро асноўнага складу слоўнікавага фонду мовы. Папулярнасці саматычных фразеалагічных адзінак спрыяюць шматлікія фактары, найперш пашыранасць саміх фразеалагізмаў у розных стылях мовы, актуальнасць іх зместу, яркая вобразнасць, эмацыянальнасць, агульназразумеласць, трапнасць, павучальнасць.

У залежнасці ад функцыянальнай прыналежнасці той ці іншай часткі цела чалавека прапануем наступную класіфікацыю саматычнай лексікі, якая стала асновай для ўтварэння шматлікіх фразеалагізмаў беларускай мовы. Адзначым той факт, што ва ўтварэнні фразеалагізмаў прымаюць удзел не толькі стылістычна нейтральныя кампаненты-саматызмы, але і тыя, якія з’яўляюцца гутарковымі ці прастамоўнымі паводле стылістычнай афарбоўкі.

1) назвы галавы і яе частак (*галава, бубен, кацялок, мазгі, вочы, вушы, цемя, твар, рыльца, рыла, лоб, чало, нос, брыво, шчокі, губы, вусны, рот, зубы, паднябенне, гартань, глотка, горла, жабры, язык – глядзець у зубы, светлая галава, глядзець іншымі вачамі, як бубен, лоб расколваецца, вадзіць за нос, вушы вянуць, кроў кінулася ў твар, крывіць губы, рылам не выйшаў);*

2) назвы частак цела (*шыя, патыліца, карак, горб, плечы, спіна, бок, пахі, грудзі, цыцкі, жывот, пуза, пуп, паясніца, зад – даваць па шыі, лажыцца на плечы, біць кулакамі ў грудзі, вецер у спіну, жывот на нос лезе, даваць пад зад);*

3) назвы канечнасцей і іх частак (*рука, лапкі, лапы, крылы, локаць, кулак, далоні, ладкі, прыгаршчы, жменя, палец, перст, дуля, кукіш, фіга, нага, калена, пята – гарыць у руках, выціраць ногі, адмахвацца рукамі і нагамі, вераб’ю па калена, кіўнуць пальцам, палец у рот не кладзі, і пальцам не крануць);*

4) назвы ўтварэнняў на скуры (*валасы, чуб, пер'е, барада, вусы, грыва,*

Рэпазіторый ГрГМУ

*шэрсць, пух – волас у волас, вісець на валаску, валасы становяцца дыбам, гладзіць па шэрсці, з барадой, і ў хвост і ў грыву);*

5) назвы ўварэнняў на канечнасцях (*капыты, кіпцюры, кіпці, пазногаць, пазногцік, ногаць – у кіпцюрах, з кіпцюроў (вырвацца), адкідваць капыты);*

6) назвы вадкасці ў целе (*кроў, сляза, пот, сліна, слінка, соплі – кроў з носа, сэрдца крывёй абліваецца);*

7) назвы скуры і яе частак (*скура, горб, шкура, гуз, скула, мазоль, радзімая пляма, струп – вылазіць са скуры, галава(лоб) гуза шукае, браць за шкіру, выязджаць на гарбе);*

8) назвы ўнутраных органаў (*пячонка,, трыбух, нутро, вантробы, кішкі, сэрца – даваць волю сэрцу, вымотваць кішкі, кішка тонкая, адкрываць сваё сэрца, камень ляжыць на сэрцы);*

9) назвы састаўных частак шкілета (*хрыбет, косці, рэбры, лапаткі – шырокай косці, косць ад косці, паласкаць костачкі, ламаць хрыбет, класць на лапаткі*).

Саматычныя фразеалагізмы складаюць адну з найбольшых і прадуктыўных груп фразеалагічнага складу мовы. Адзначаецца, што прыблізна 25% усіх фразеалагічных адзінак можна аднесці да саматычных у любой мове. Саматычная фразеалогія з'яўляецца ўніверсальнай, бо менавіта чалавечае цела выступае аб'ектам вывучэння навакольнага свету, з дапамогай яго адбываецца ацэнка навакольнай рэчаіснасці. Лексемы з саматычнымі кампанентамі надзвычай актыўныя ва ўтварэнні фразеалагізмаў беларускай мовы. Менавіта праз такія адзінкі адлюстроўваецца нацыянальная і культурная спецыфіка народа, яго працэс развіцця, менталітэт, мадэлі паводзінаў і каштоўнасці. Аналіз такіх фразеалагізмаў раскрывае агульныя і прыватныя культурныя асаблівасці народа, які з’яўляецца стваральнікам такіх адзінак.

ЛІТАРАТУРА:

1. Занковец, А. А. Особенности и закономерности словообразования соматизмов русского и белорусского языков / А. А. Занковец // Русский язык: система и функционирование : сб. материалов IV Междунар. науч. конф., г. Минск, 5-6 мая 2009 г. : в 2 ч. – Ч. 2. – Минск : РИВШ, 2000. – С. 26–28.

# ТЫПЫ СЛОЎНІКАЎ У БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКАГРАФІІ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Пакаціла М.А.,студэнт 1 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Паводле прызначэння ўсе слоўнікі аб’ядноўваюцца ў два асноўныя тыпы – энцыклапедычныя і лінгвістычныя.

Энцыклапедычныя слоўнікі тлумачаць не словы, а паняцці, абазначаныя гэтымі словамі; у сціслай форме ў іх выкладзены навуковыя веды пра



Репозиторий ГрГМУ